*Шаройка А.М. (Беларусь, г. Мінск)*

# БЕЛАРУСКІ МУЗЫЧНЫ ФАЛЬКЛОР ЯК ПРАДМЕТ ВІЗУАЛЬНАЙ АНТРАПАЛОГІІ

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Візуальная антрапалогія на сённяшні дзень лічыцца адным з перспектыўнейшых накірункаў у замежнай і айчыннай культуралогіі. Яна накіравана на атрыманне і ўкараненне ў сацыяльную практыку экраннай інфармацыі аб малавядомых старонках жыцця народаў з мэтай здзяйснення дыялогу культур.

Візуальная антрапалогія як культуралагічная дзейнасць будуецца на ўзаемадзеянні экранных відаў мастацтва (кіно, тэлебачанне, дыгітальнае мастацтва), гуманітарных навук (этналогія, фалькларыстыка) і інфармацыйных тэхналогій.

Візуальная антрапалогія ў сваіх даследаваннях абапіраецца на выяўленчыя, выяўленча-гукавыя і гукавыя крыніцы. У гэтым сэнсе асаблівую каштоўнасць уяўляюць фільмы як форма запісу выявы ў руху, незалежна ад яе матэрыяльнага носьбіта.

Сёння сучасныя відэатэхналогіі дапамагаюць у правядзенні даследчыцкай працы візуальных антраполагаў і менавіта аўдыёвізуальны матэрыял становіцца вынікам іх даследавання. На думку культуролага В. Хрыстафоравай, у параўнанні з наратыўным (пісьмовым) матэрыялам, візуальны нясе ў сабе больш неапрацаванай інфармацыі, таму сітуацыя «поля» працягнецца дома, пры кожным праглядзе [1].

Візуальная антрапалогія ў беларускай дакументалістыцы пачала фарміравацца дзякуючы намаганням этнамузыколага доктара мастацтвазнаўства З. Мажэйкі. Убачанае і пачутае падчас палявых экспедыцый 1970 - 1990-х гадоў натхніла даследчыка на неабходнасць аўдыёвізуальнай фіксацыі рарытэтнага, унікальнага фальклорнага матэрыялу. У выніку па сцэнарыях З. Мажэйкі кінематаграфістамі творчага аб'яднання «Летапіс» Нацыянальнай кінастудыі «Беларусьфільм» было знята сем этнамузыкалагічных фільмаў (вызначэнне В. Нячай): «Палескія калядкі» (1972 г., рэжысёр Н. Савва, аператар М. Бераў, У. Цэслюк, «Галасы вякоў» (1979 г., рэжысёр Н. Савва, аператар А. Шклярэўскі), «Памяць стагоддзяў» (1982 г., рэжысёр Н.Савва, аператар Ю. Ялхоў), «Палескія вяселлі» (1986 г., рэжысёр Ю. Лысятаў,

аператар М. Сідорчанка), «Пранясі, Божа, хмару» (1990 г., рэжысёр А. Шклярэўскі), «Крывыя вечары» (1993 г., рэжысёр Ю.Лысятаў, аператар М. Сідорчанка. А. Казазаеў), «Рух зямлі» (1999 г., рэжысёр Ю. Лысятаў, С. Гайдук, аператар М. Сідорчанка). У 1994 г. за свае фільмы З. Мажэйка разам з рэжысёрам Н. Савва і аператарам А. Шклярэўскім атрымала Дзяржаўную прэмію БССР.

У навукова-папулярных фільмах, створаных па сцэнарыях З. Мажэйкі, прадстаўлена агульная песенная культура Беларусі, якая складаецца з мясцовых традыцый Паўночнага (Паазер'е), Паўднёвага (Палессе), Усходняга (Падняпроўе), Заходняга (Панямонне), Цэнтральнага этнакультурных рэгіёнаў краіны. Асаблівую зацікаўленасць З. Мажэйкі выклікаў музычны фальклор Палесся, прадстаўлены ва ўсіх сямі этнамузыкалагічных фільмах. Яго ўнікальнасць заключана ў галасным спеве на адкрытым паветры, карнавалізацыі абраднасці (каляндарнай і вясельнай), традыцыя «галасных» спеваў і сфарміраванай народнай школе сумесных («гуртавых») спеваў - гетэрафоннага і падгалосачнага.

У беларускай глыбінцы З. Мажэйка знайшла ўнікальных носьбітаў народнай музычнай традыцыі і прымусіла гаварыць аб самабытнасці і таленце выканаўцаў Сцяпана Дубейкі, Ганны Вянгуры, Алеся Карэнчука, Хрысціны Дарашэвіч. Як зазначае сам даследчык, гэтыя і іншыя спевакі і музыкі (свайго рода народныя карыфеі) выступаюць у якасці бясспрэчных духоўных лідэраў, своеасаблівых гравітацыйных цэнтраў руральнага музыкальна-гукавага асяроддзя. Яны адлюстроўваюць спрадвечную цягу носьбітаў руральнай традыцыі да пазачасавых духоўных каштоўнасцей («векавечным песням») у адпаведнасці з нацыянальна-рэгіянальным модусам мастацкага мыслення [2, с. 41 ].

Антэйныя архетыпічныя матывы спеваў беларусаў яскрава праявіліся ў паняцці «рух зямлі», які трэба ўлавіць, каб голас набыў магічную сілу. У фільме «Рух зямлі» ўнук этнічных беларусаў з Сібіры Міхась Басякоў успамінае. як калісьці на Магілёўшчыне яго бабка Лізавета з іншымі жанчынамі голасам адганяла хмару, што ішла на іх ніву: «Сталі і неяк доўга засяроджана нібы калыхаліся, падняўшы ўгору абедзве рукі. Вось і я хачу цяпер рух зямлі ўзяць і голас адганяць чарнобыльскую бяду, што навалілася на мой край» (мал. 1).



Малюнак 1. Кадр з фільма «Рух зямлі». Спевакі Міхась Басякоў (злева) і Сцяпан Дубейка (справа)

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У этнамузыкалагічных фільмах, створаных па сцэнарыях З. Мажэйкі, прадстаўлены песенны фальклор галоўных абрадаў народнага календара: Гуканне вясны, Купала, Дажынкі, Каляды. Падчас іх экраннай фіксацыі акцэнт быў зроблены на канвенцыях, пры дапамозе якіх канструіруецца паведамленне (візуальны матэрыял). У кожным з фільмаў аператары фіксавалі тэатралізаваныя народныя прадстаўленні на месцы, імкнуліся разгледзець дэталі, заўважыць яскравыя асаблівасці ігры «артыстаў», перадаць стыхію свята. Так узніклі гукапластычныя вобразы, якія дапамаглі адчуць станы чалавечай душы ў кантакце з прыродай і песняй у іх кантрастах і адзінстве.

Унікальныя фільмы аб беларускім аўтэнтычным фальклоры З. Мажэйкі атрымалі шырокае міжнароднае прызнанне. У ліку ўзнагарод - прызы на І і IV Міжнародных фестывалях аўдыёвізуальнай культуры ў Пярну (Эстонія - 1987 г. і 1991 г.), на Міжнародным аглядзе экалагічных, спартыўных і турыстычных фільмаў у Злаціборы (Югаславія, 1993 г.), на І Міжнародным кінафестывалі славянскіх і праваслаўных фільмаў у Югаславіі і на X Міжнародным кінафестывалі этналагічнага фільма ў Югаславіі (2001).

Этнамузыкалагічныя фільмы, створаныя па сцэнарыях З. Мажэйкі, маюдь вялікую навуковую і практычную каштоўнасць. Яны могуць выкарыстоўвацца ў выкладчыцкай дзейнасці замежных і айчынных даследчыкаў. Кінастужкі цыкла ўключаны ў вучэбна-культурную праграму Калумбійскага ўніверсітэта (ЗША). Прафесар гэтага ўніверсітэта Алан Ламаке адзначыў вялікі сэнс гэтых стужак для вывучэння беларускага музычнага фальклору, нацыянальнага меласу і яго таленавітых носьбітаў. Кіназнаўца Аўгусцін Янулайціс (Навукова-даследчы інстытут кінамастацтва, Масква) назваў цыкл фільмаў З. Мажэйкі ўнікальным па навуковай і мастацкай раўнацэннасці.

У 1990-я гг. пачатую З. Мажэйкай справу працягнулі этнамузыколагі Іна Назіна і Галіна Таўлай. Яны паспрыялі ўзнікненню шэрагу фільмаў вытворчасці РУП «Белвідэацэнтр» Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь аб інструментальнай музыцы беларусаў. Так, па сцэнарыях доктара мастацтвазнаўства Іны Назінай быў зняты цыкл навукова-папулярных дакументальных стужак «З гісторыі беларускіх музычных інструментаў»: «Галасы зямлі маёй» (1994 г., сасцэнарыст Р. Гамзовіч, рэжысёр Ю. Лысятаў, С. Фрыдлянд), «Грай, скрыпка, грай» (1994 г., рэжысёр і аператар Ю. Гарулёў), «Дудка» (1995 г., рэжысёр Ю. Лысятаў, аператар Д. Хайцін), «Труба і рог» (1995 г., рэжысёр Ю. Лысятаў, аператар М. Сідорчанка); «Бубен і барабан» (1997 г., рэжысёр і аператар А. Суханава). У сцэнарыях да фільмаў даследчык зрабіла акцэнт на раскрыцці спецыфікі штучнага вырабу народных інструментаў, рэпрэзентацыі ўзораў найгрышаў усіх гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў краіны, у выніку чаго атрымалася сапраўдная аўдыёвізуальная анталогія фальклорна-інструментальнай музыкі Беларусі. З пункту гледжання этнаарганалогіі, у фільмах цыкла «З гісторыі беларускіх музычных інструментаў» аказаліся ахопленымі ўсе класы народнай інструментальнай музыкі (сігнальны, гукаперaймальны, песенны, танцавальна-маршавы). І. Назіна сабрала ў сваіх стужках унікальных носьбітаў народнай музычнай традыцыі. Героямі дакументальных карцін сталі майстры Р. Шамак, М. Куўшынаў, М. Капейка,
П. Ешчанка, М. Шкадун і іншыя музыкі, якія захавалі традыцыі вырабу і выканальніцтва на народных музычных інструментах.

Асаблівай лірычнай інтанацыяй прасякнуты фільмы «Галасы зямлі маёй», «Дудка», «Труба і рог», знятыя Ю. Лысятавым. У іх праявілася імкненне да партрэтавання народных



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

майстроў, улюбёных у свае інструменты, раскрыцця гармоніі ўласнага свету з навакольным. Героі кінастужак ставяцца да прыроды па-асабліваму: яна з'яўляецца для іх натхняльнай крыніцай творчасці. Па прызнанні народнага майстра-дудачніка М. Капейка: «Вучыцца музыцы трэба ў прыроды, перш за ўсё ў птушак, паколькі прырода - гэта і ёсць музыка» (мал. 2).



Малюнак 2. Кадр з фільма «Галасы маёй зямлі». Музыка М. Капейка

Па сцэнарыях кандыдата мастацтвазнаўства Галіны Таўлай у 1995 г. рэжысёрам Станіславам Гайдуком было знята два фільмы-партрэты: «Рассыпушка» і «Мужчынскі рой». У першай з кінастужак галоўнай гераіняй стала гарманістка з Брэсцкай вобласці ГаннаЯфімук, у другім - народныя музыкі з Гродзеншчыны.

Такім чынам, этнамузыколагі З. Мажэйка, І. Назіна, Г. Таўлай зрабілі беларускі музычны фальклор прадметам візуальнай антрапалогіі. Іх фільмы накіраваны на папулярызацыю ў масавай аўдыторыі вынікаў навуковых даследаванняў і маюць асаблівую каштоўнасць як аўдыёвізуальныя дакументы, якія ў сваю чаргу могуць выкарыстоўвацца ў навуковых і педагагічных мэтах.

**ЛІТАРАТУРА**

1. Христофорова, О. Полевые методы в визуальной антропологии / О. Христофорова [Электронный ресурс]. - Режим доступа : http://www.ruthenia.ru/folklore/hristoforova3.htm. - Дата доступа: 01.07.2010.

2. Можейко, З. Руральные народно-песенные традиции в свете ноосферной идеи / З. Можейко // Весці БДАМ. - 2007. - № 10.-С.41 -43.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ